Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(51), Ч1, 2008

*УДК 882.6 (092) Рублеўская*

# Жанры масавай літаратуры ў творчасці Людмілы Рублеўскай

А. М. Аўчарэнка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сучасная літаратура прадугледжвае жанравую шматварыянтнасць. Адзначанае мае адносіны і да літаратурнага працэсу, і да канкрэтных, адзінкавых тэкстаў. Таму мы маем права казаць пра сінкрэтызм як пра агульную ўласцівасць сучаснай літаратурнай сітуацыі. І гэтая з'ява зусім натуральная, калі мець на ўвазе той даўгі жыццёвы шлях, які мае за сваімі плячыма пісьмовая культура. А ў яе межах адбылася рэалізацыя, пражыванне і засваенне ці не ўсіх магчымых літаратурных формаў. У выніку назапашаны праз стагоддзі досвед пачаў адчуваць неабходнасць пераварыць інфармацыю ў сітуацыі, калі прамоўлена зашмат. І такое пераасэнсаванне палягае ўжо ў самой сінкрэтычнай прасторы, якая праз магчымасць камбінавання разнастайных культурных знакаў захоўвае здольнасць літаратуры да абнаўлення.

У беларускай тэкставай прасторы прыкладам мысленчага і творчага сінкрэтызму з'яўляецца творчасць Людмілы Рублеўскай. Тут маюцца на ўвазе творы "Сэрца мармуровага анёла", "Пярсцёнак апошняга імператара" і "Золата забытых магілаў", у межах якіх удала арганізаваныя адметныя рысы аж трох жанравых сістэм. Гэта: прыгоды, дэтэктыў і меладрама. Нагадаем, што менавіта названыя віды літаратуры адны з самых старажытных, таму найбольш удала ўвасабляюць наратыўныя архетыпы. А яны якраз і забяспечваюць прыхільнасць і папулярнасць у чытача, для якога спасціжэнне "вечнага, добрага, мудрага" зусім не ёсць асноўным стымулам да прачытання кнігі. Непрафесійнаму спажыўцу літаратуры больш рупяць такія будзённыя рэчы, як простае атрыманне асалоды ад самога працэсу чытання і магчымасць пазбегнуць непрывабнай рэчаіснасці. А якраз гэта і стварае свет папулярнай фабульнай літаратуры, у якой працэс пражывання і перажывання чытачом выдуманых літаратурных калізій ёсць неабходнай рысай.

Сюжэтным стрыжнем твораў "Сэрца мармуровага анёла", "Пярсцёнак апошняга імператара" і "Золата забытых магілаў" ёсць таямніца, вакол раскрыцця і пераадолення якой разгортваецца дзеянне. Адсюль вынікае сувязь адзначаных твораў з дэтэктывам, які заўсёды трымаецца на такіх элементах сюжэту, як пошук, расследаванне, раскрыццё. Аднак заўважым, што таямніца толькі спадарожны, а не стрыжнёвы элемент тэкстаў. Нягледзячы на тое, што матыў пошуку скразны напрацягу разгортвання ўсіх сюжэтаў, пісьменніца больш увагі аддае мадэляванню прыгодніцкай канвы. Іншымі словамі, маналітнасць пабудовы дэтэктыўнай таямніцы страчваецца: яе стальны каркас разбураецца праз шматлікія прыгодніцкія і меладраматычныя лініі-ўстаўкі, якія ніяк не маюць наблізіць нас да спасціжэння схаванай ісціны. Больш таго, прыгоды – нашмат выразнейшая дамінанта тэкстаў пісьменніцы. (Так, твор "Золата забытых магілаў" мае найменей нагадваць дэтэктыў. Занадта шмат у ім ад прыгодніцкага рамана на гістарычную тэму. Што тычыцца яго другой "паралелі" – аповяда пра паўстанцкага філосафа Вінцэся Рашчынскага – , то тут ёсць і крытыка прыгоннага ладу, і зварот да падзей паўстання 1863 года, і узгадванне сапраўдных гістарычных асобаў). Таму мы можам казаць хіба што пра сувязь адзначаных тэкстаў з дэтэктывам. Пра яе нагадвае наяўная ў творах таямніца, якая мае стрыжнёвы характар, а таксама некаторыя дэтэктыўныя прыёмы: шантаж з элементамі гульні, ("Пярсцёнак апошняга імператара"), рэалізацыя вядомай ісціны "найлепш схавана тое, што знаходзіцца навідавоку" ("Сэрца мармуровага анёла"), выпадковая або наўмысная падмена ("Пярсцёнак апошняга імператара", "Золата забытых магілаў").

Тыповым ёсць і паглыбленне этычнага зместу, што з'яўляецца адметнай уласцівасцю тэкстаў адзначанага віду. Менавіта дэтэктыўная таямніца растуляе перад намі сапраўдную сутнасць герояў, выяўляе іх чалавечыя характары. Ужо сама ўнутраная логіка жанра, якая

прадугледжвае пераадоленне ліха, заключае ў сабе паўстанне і развязанне праблемы дабра і ліха. І ў сувязі з тым, што сучасны чытач прагне пазбыцца непрывабнай будзёншчыны і шукае пазітыву, развязка праблемы – вядомая: адназначнае асуджэнне ліхога і перамога добрага ў памкненнях гранічна станоўчых герояў.

Але этычны элемент аповесцяў і рамана мае больш глыбокую, у параўнанні з класічным дэтэктывам, сутнасць. Бо ацэнкай "добрае – ліхое" пазначаецца не толькі сам факт злачынства. Дадзеная катэгорыя закранае ці не ўсе сюжэтныя элементы. Урэшце творы пачынаюць прэтэндаваць на тое, што не ўласціва дэтэктыўнаму жанру: перадаць складанасць і неадназначнасць паняццяў. У іх ліха не заўсёды ліха, а дабро часам ператвараецца на сваю процілегласць. Так, у святле дадзеных катэгорыяў зусім іначай, чым на пачатку твору, паўстаюць характары герояў Марка Ялецкага і Кастуся Сташынскага ("Пярсцёнак апошняга імператара"). Іх процілеглыя полюсы пад час разгортвання сюжэтаў цалкам мяняюцца на адваротныя. Гэткую ж этычную неадназначнасць нясе ў сабе і вобраз Вінцука з аповесці "Сэрца мармуровага анёла", які знішчае ў агні старажытны крыж сваіх продкаў, які не толькі матэрыяльная каштоўнасць (тут асацыяцыя з ліхам, спакусай), але і частка нашай культурнай, гістарычнай спадчыны. Аднак заўважым, што дадзеная амбівалентнасць паняццяў зусім не заблытвае чытача. Ён не мае небяспекі заблукаць у лабірынтах маральнасці. Бо грунтам гэтай няпростай этыкі з'яўляецца ўсім зразумелая, пэўная, дакладная пазіцыя героя: "Грэх выцягваць з магілы на божы свет тое, што вечна будзе несці з сабой спакусу сквапнасці і зайздрасці!" [1, с. 121]. А менавіта гэтая адназначнасць і патрэбная чытачу, бо яна ёсць умовай рэалізацыі адной з функцый папулярнага, у тым ліку і дэтэктыўнага, тэксту – атрымаць задавальненне. У выніку, як той казаў, забіваюцца два зайцы: чытач не забываецца на маральнасць і атрымлівае радасць ад звычайнага прачытання цікавага фабульнага твору.

Вышукваючы недахопы ў папулярнай дэтэктыўнай форме, крытыка зазвычай адзначала, што яму не стае індывідуалізаваных, напоўніцу раскрытых мастацкіх характараў, псіхалагізму ў іх паказе. І такое меркаванне мае сваю абгрунтаванасць. Аднак такая схема пабудовы дадзеных твораў, у якіх галоўная ўвага надаецца логіцы раскрыцця таямніцы. Рацыянальнае, такім чынам, выцясняе пачуццёвае, суб'ектыўнае. Што да аповесцяў "Сэрца мармуровага анёла", "Пярсцёнак апошняга імператара", рамана "Золата забытых магілаў", то яны як творы, што пабудаваныя на грунце трох папулярных жанраў, цалкам пазбаўлены названай "заганы". Мастацкія характары, выведзеныя тут, з'яўляюцца ярка выражанымі індывідуальнасцямі. Героі твораў адметныя, не такія, як усе, паводле свайго ўнутранага свету, думак, паводзінаў. Адзначанае асабліва датычыць жаночых вобразаў. Магда з аповесці "Пярсцёнак апошняга імператара", Кася з "Сэрца мармуровага анёла", Паліна з "Золата забытых магілаў" ўвасабляюць сабой ідэал сучаснай жанчыны. Трэба сказаць, што Людміла Рублеўская з вялікай прыязнасцю стварае мастацкія вобразы сваіх гераінь, акцэнтуючы ўвагу на такіх рысах, як незалежнасць, унутраная разняволенасць, адчуванне ўласнай рацыі, жаданне і ўменне дасягнуць пастаўленай мэты. І ўсё гэта – у рамантычнай манеры пісьма, якая, аднак, не адмаўляе папраўкі на сучаснасць: цяпер жаночы вобраз роўны рамантычнаму вобразу "рыцара ў спадніцы". Эмансіпацыя адыграла сваю ролю: у творах Л. Рублеўскай жанчыну можа ўпрыгожваць не толькі шляхетная доўгая спадніца (Паліна з "Золата забытых магілаў"), але і не дужа ахайныя джынсы і мужчынская кашуля (Магда з "Пярсцёнку апошняга імператара"). Аднак, што да праўды, у тэкстах пісьменніцы такая дробязь не пазбаўляе жанчыну жаноцкага. Яна верная сваёй існасці ў самых складаных сітуацыях, у якіх, тым не менш, не шукае простых шляхоў і не спыняецца на паўдарозе. Так, не ў намеры Касі ("Сэрца мармуровага анёла") чакаць, пакуль невядомае высветліцца, як у чароўнай казцы, само па сабе. І ўрэшце яе настойлівасць, назіральнасць, уменне мысліць лагічна прыносяць першыя поспехі ў раскрыцці таямніцы. Яна апынаецца ў патаемнай майстэрні – і тут калізія зноў завастраецца, а ў выніку ёй становіцца вядомым самы сапраўдны дэтэктыў, але не літаратурны, а жыццёвы.

Адзначым таксама, што такая асучасненасць гераінь у тэкстах Л. Рублеўскай не тоесная бунту жанчыны супраць сваёй спрадвечнай сутнасці. У пісьменніцы гэта хіба што імкненне захаваць сябе як асобу: "Не, гэта не быў выбар паміж прафесійнай апантанасцю і ся-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мейнасьцю. Хутчэй – уцёкі ад лёсу плюшча,” [1, с. 44] – сцвярджае гераіня з рамана “Золата забытых магілаў”, калі адмаўляецца ад сямейнай угрунтаванасці і дабрабыту.

Як для дэтэктыва, то названым творам, вядома, не стае аналітыкі, логікі ў разгортванні падзеі, улучанасці чытача ў працэс раскрыцця таямніцы, чым дасягаецца славуты гульнёвы характар жанру. Дый само выкарыстанне дэтэктыўных прыёмаў вельмі абмежаванае.

Куды больш сур’ёзны акцэнт робіцца на прыгодніцкіх элементах сюжэту. Адметна, што гэта выяўлена нават на вербальным узроўні аднаго з тэкстаў. “Люблю вандраваць. Часам гэтая схільнасць ублытвае мяне ў авантурныя падзеі…” [1, с. 80], – так заўважае гераіня аповесці “Сэрца мармуровага анёла”, нібы праграмуючы характар ўсяго наступнага развіцця дзеяння. Што ж непасрэдна да прыгодніцкага, то ў абедзвюх аповесцях і рамане дзейнічае логіка выпадковасці, што якраз і ёсць характэрнай адзнакай авантурных тэкстаў. Напрыклад, адразу з яе пачынаецца і ёю развязваецца сюжэт твора “Пярсцёнак апошняга імператара”. Каб не завітала Магда – галоўная гераіня аповесці – да састарэлага дзівака, ніколі б не паўстала з нябыту таямніца, не было і яе разгадкі, а лёс дзедавых вершаў не склаўся б нагэтулькі ўдала. І гэтая ўдаласць – таксама хіба збег абставінаў ды яшчэ мастацкі прыём, які дазваляе дасціпна павярнуць сюжэт і дасягнуць жаданага хэпі-энду, да якога і мусяць імкнуцца творы такога кшталту. У рамане ж “Золата забытых магілаў” тую самую функцыю мае выпадковая сустрэча Паліны з беларускім скульптарам у Вільні: з яе завязваецца вузел таямніцаў, расследаванню якіх будзе прысвечаны ўвесь твор.

Змест тэкстаў Л. Рублеўскай – таксама выключна прыгодніцкага кшталту. Для яго характэрна спрэсаванасць, інтэнсіўнасць дзеяння, засяроджанасць на сюжэце. Сачыць за ім проста і цікава. Ён ляжыць на паверхні. Менавіта таму кнігі пісьменніцы мусяць карыстацца такой папулярнасцю сярод шараговага чытача.

Вядома, што разгортванню прыгодніцкіх элементаў твораў спрыяе іх сюжэтная напоўненасць сучаснымі рэаліямі. Так, аповесць “Сэрца мармуровага анёла” – не проста гісторыя таямніцы старажытнага крыжа роду Вярбіцкіх. Гэта аповед, у тэкст якога ўведзены самыя тыповыя прыкметы сённяшняга часу: падробка шэдэўраў мастацтва, арганізаваная кантрабандная дзейнасць па іх продажы, крывавыя разборкі з удзелам целаахоўнікаў. Апісаныя мадэлі, вядома, не ёсць уласным вынаходніцтвам аўтаркі. І тут Л. Рублеўская не пазбегла шаблонаў. Праўда, банальнасцяў усяго каліва: глупая багатая прыгажуня, моцныя крутыя хлопцы, якія таксама акадэміяў не канчалі, ды хцівасць і ўладнасць жонкі. Як для дадзенага жанра, то не так ужо і багата.

Ва ўсіх трох творах Л. Рублеўская стварае эфектную кульмінацыю (уласцівасць прыгодніцкай літаратуры), у якой напружанне (suspense) дасягае сваёй вышыні. Напрыклад, у “Сэрцы мармуровага анёла” гэта сцэна знішчэння крыжа, у “Пярсцёнку апошняга імператара” – сутычка з адурманенымі маладзёнамі, у “Золаце забытых магілаў” – захоп “спецназаўцамі” знойдзенага золата. І гэтае напружанне мае прыгодніцкую канву: у ім адчуваецца гранічная выражанасць – аж да таго, што героям пагражае смяротная небяспека. Тут навідавоку уласцівасць прыгодніцкай літаратуры да адыходу за межы штодзённага, звычайнага, адчуваецца характэрная для такога віда творчасці празмернасць дзеянняў, пачуццяў, жарсцяў. Але гэтая празмернасць – толькі ў дачыненні да рэальнасці, якой, нагадаем, чытач і імкнецца пазбегнуць. У самім жа тэксце выглядае яна зусім натуральна, бо мае адносіны з жанрамі масавай літаратуры.

Што да вобразнай сістэмы, то яна таксама пабудаваная ў адпаведнасці з прыгодніцкай канвой твораў. Гэта вытанчаная гераіня, высакародны герой, іх сябра, герой-злодзей. Кожны з вобразаў нясе сваю нязменную функцыю. Нетыповая рамантычная прыгажуня трапляе ў розныя незвычайныя гісторыі, мужны і годны герой дапамагае з іх выходзіць, падступны герой-злодзей стварае разнастайныя перашкоды. Праўда, значэнне і функцыянальная скіраванасць вобразаў таксама маюць сваю сучасную мадыфікацыю. Гераіня становіцца больш дзейснай і актыўна ўдзельнічае ў пераадоленні перашкодаў, а ў вачах героя ні-ні, да й праслізвае нешта ад звычайнага чалавека (пагатоў гэта ўжо не “рыцар без страху і папроку”). Адносна апошняга вартым падаецца параўнанне галоўных герояў у паралельным рамане “Золата забытых магілаў”. Вобраз сучаснага мужчына Валянціна – трохі нязграбнага, часта

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нерашучага і няўпэўненага – яўна адрозны ад постаці Вінцэся – сапраўднага рамантычнага Героя, удзельніка Французскай рэвалюцыі, змагара і філосафа. І гэта на фоне аднолькавасці імёнаў: Валянцін – толькі сучасны варыянт Вінцэся. Нічога не зробіш, кожны час, кожная эпоха спараджае свае характары – і герой нашага часу мае быць зусім іншым.

Авантурна-дэтэктыўную аснову аповесцяў Л. Рублеўскай дапаўняюць і меладраматычныя элементы, звязаныя найперш з сюжэтнай лініяй кахання, якая нязменна прысутнічае ў абсалютнай большасці твораў пісьменніцы. Адметна, што яна мае сваёй рэалізацыяй адну з самых традыцыйных формулаў – формулу так званага “любоўнага трохкутніка” (Магда – Марка – Кастусь у “Пярсцёнку апошняга імператара”, Кася – Вінцук – Віта ў “Сэрцы мармуровага анёла”, Паліна – Валянцін – Дзіна, а таксама Вінцэсь – Вальжына – Ваўкалак у рамане “Золата забытых магілаў”). Асабліва меладраматычна выглядаюць любоўныя калізіі ў “Сэрцы мармуровага анёла”, “Золаце забытых магілаў”, дзе знайшлося месца традыцыйным жанравым складнікам: каханне, здрада, падступства, прага грошай і, вядома, новае, ужо сапраўднае пачуццё, якое вяртае жаданне жыць.

У “Сэрцы мармуровага анёла” і “Золаце забытых магілаў” рамантычная гісторыя змадэлявана згодна апрабаванай схеме “пачварына і прыгажуня”. Нават адмыслова падкрэсліваецца няўклюднасць, крывасць герояў-мужчынаў: “Валянцін расцвіў усмешкай, і яго непрывабныя рысы раптам асвяціліся знутры”[2, с. 127]. Вінцук з аповесці “Сэрца мармуровага анёла” ўвогуле мае сабою нагадваць ледзь не казачнага пачварыну з Сярэднявечча. Пагатоў і жыве ён у старадаўнім панскім доме, выгляд якога змушае ўзгадваць вусцішныя гісторыі пра прывідаў. Ды й сам ён падобны ці не да аднаго з яго легендарных жыхароў: “Высокі нязграбны чалавек – ці прывід? – меў гадоў пад сорак” [1, с. 86]. Чым далей – тым болей: мэтаскіравана вобраз Вінцука проста ствараецца ў стылі славутай казачнай гісторыі пра пунсовую кветку: “Твар худы, а вочы ненатуральна светлыя і глядзяць спадылба, праз нерасчэсаныя пасмы…” [1, с. 86]. Але наведзеная аўтаркай вусціш – у адпаведнасці з правіламі жанру – мае развеяцца, як казачны сон: каханне разбівае наведзеныя чары, маска пачварыны спадае і перад намі паўстае сапраўдны Прынц. Простая гісторыя, якая і праз стагоддзі не згубіла сваёй прывабнасці.

Заўважым таксама, што абедзве аповесці і раман цалкам увасабляюць меладраматычную формулу, якая, згодна з Дж. Кавэлці, “…апісвае свет, напоўнены гвалтам, але кіраваны маральным прынцыпам справядлівасці” [3; с. 34]. Якраз гэтым абумоўлена традыцыйная, яшчэ са старажытных часоў развязка твораў: узнагарода каханнем у выглядзе прывабнай жанчыны. Праўда, у Л. Рублеўскай яна, развязка, гендэрна трансфармуецца: сучасная дзяўчына, неардынарная і незалежная, не проста сядзіць у чаканні прынца, але прыкладае немалыя намаганні дзеля здабыцця агульнага з каханым шчасця. А гэта толькі яшчэ раз падкрэслівае жаночую ментальную прыроду дадзеных тэкстаў.

Зазначым таксама, што прыгодніцкі грунт твораў аўтаркі шчыльна звязаны з асноўнымі складнікамі сістэмы рамантызму. Паказальна ў гэтым аспекце тое, што адзін з герояў “Пярсцёнку апошнага імператара” яшчэ на самым пачатку твора пра сябе і сваіх сяброў – з пэўнай доляй зняверанасці і скрухі – гэтак і кажа: “Рамантыкі…” [1, с. 7]. Сярод некаторых аспектаў гэтай сістэмы наступныя: 1) імкненне да ідэальнага, 2) цікавасць да мінуўшчыны, 3) пачуццёвасць, 4) адчужанасць галоўных герояў, 5) драматызм сітуацый.

Асобна варта сказаць пра ці не самы істоты складнік гэтай сістэмы – цікавасць да нацыянальнае мінуўшчыны. Са старонак твораў Л. Рублеўскай перад намі паўстае вобраз Беларусі, за плячамі якой шматвекавая слаўная гісторыя. Ці не ў кожнай прыгодніцка-рамантычнай кнізе пісьменніцы пануюць водгукі славутага паўстання 1863 года. Героі яе твораў – амаль заўсёды нашчадкі годных і славутых у мінулым людзей, шляхцічаў не толькі па крыві, але і па духу. Апроч таго, яны – прафесійныя аматары беларускае даўніны. Напрыклад, Кася – знаўца беларускага мастацтва XVI стагоддзя, Паліна – гісторык, здольны ўласнаручна ўратаваць старажытную драўляную скульптуру, Кастусь – таксама гісторык, які дзеля захавання старажытных дакументаў можа ахвяраваць уласнай крывёю. Ды й сама Л. Рублеўская – відаць з яе кніг – вялікая аматарка таямніц беларускай гісторыі. Што ні твор, то пошук нейкай частачкі нашае мінуўшчыны. Так, менавіта яе, а не рэальны зборнік вершаў, крыж з унікаль-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

най чорнай перлінай ці золата паўстанцаў шукаюць героі тэкстаў. А сам абраны шлях пошуку – намаганне "…злавіць кінутую на бераг з чаўна вяроўку", каб бура не "…паглынула човен разам з тымі, хто на ім."[1, с. 54]. У гэтым ён – прапанаваны пісьменніцай ідэалістычны, але просты шлях самазахавання чалавека, асобы, гісторыі.

Адзначаны матыў пераемнасці даўніны і сучаснасці скразны для тэкстаў аўтаркі. Нездарма ж з кожнага з прыгадваемых намі тэкстаў паўстае вобраз магілы/надмагілля. І тут не проста водгукі гатычнага рамана з яго зададзенасцю паглыбіць атмасферу таямнічасці, невытлумачальнасці, якая проста такі вабіць чытача. (Хаця, бясспрэчна, прысутнічае і гэта). Магіла ў беларускай знакавай прасторы яшчэ і вобраз-архетып. Чаго вартая тут адно творчасць Купалы з яго курганамі, за якімі невымерная сіла, велічнасць і … неразгаданасць. Яны ж сімвалы даўніны. Падобнае значэнне мае гэты вобраз і ў тэкстах Л. Рублеўскай. У паралельным рамане надмагілле становіцца запаветам. Гэта своеасаблівы знак памяці, які звернуты да формы наглядных скульптурных вобразаў. Разгадаць ягоную сутнасць пад сілу толькі таму, хто любіць Беларусь. І не проста любіць, але ведае яе гісторыю і рупіцца яе захаваннем. У гэтым, відаць, аўтарка заключае магчымасць нацыянальнага адраджэння, шлях якога праз памяць да будучыні.

Канечне, рамантызм Л. Рублеўскай не мае прэтэнзіі на тое, каб адлюстроўваць літаратурны напрамак. Гэта хіба што адна з тыповых рысаў меладраматычных і прыгодніцкіх тэкстаў. А яшчэ – блізкае аўтарцы духоўна-эстэтычнае поле. І гэта дазваляе нам бачыць у асобе пісьменніцы спадкаемніцу авантурна-дэтэктыўнай традыцыі Ўладзіміра Караткевіча. І калі ў аповесцях гэтае наследаванне хутчэй эстэтычнае і светаглядна, то ў "Золаце забытых магілаў" – яўнае і канкрэтнае. Тут відавочныя прамыя адсылкі да славутага рамана "Каласы пад сярпом тваім". І яны датычныя не толькі агульнай тэмы паўстання, якая адна з асноўных у творы Л. Рублеўскай. Два тэксты знітоўваюць шмат больш канкрэтныя, нават прыватныя элементы. Так, надзвычай выразнымі паўстаюць вобразныя паралелі: Алесь Загорскі – Вінцэсь Рашчынскі, Чорны Война – Ваўкалак, Міхаліна – Вальжына. А ўжытыя пісьменніцай рэмінісцэнцыі часам сягаюць ці не ўзроўню цытавання: "Побач … магільныя пліты іншых Рашчынскіх. Толькі прадзеда Ганорыя няма – але ён нават сваёй адрынутасьцю дапамагае нашчадку знайсьці правільнае рашэньне… **Бо застаюцца адны магілы. Застаюцца заўсёды…**" (вылучана намі – А. А.) [2, с. 156] (Л. Рублеўская). – "**У мяне няма нічога, акрамя магіл,** бо я ваш сын" (вылучана намі – А.А.) [4, с. 77] (Ул. Караткевіч). Апроч таго, адзін з герояў рамана гэтак і кажа: "Калісьці я зачытваўся раманам "Каласы пад сярпом тваім" Уладзіміра Караткевіча" [2, с. 86]. Відавочна, што тое ж мае прамовіць і сама пісьменніца, якая шмат чаго выкарыстоўвае не толькі з досьведу масавай літаратуры, але і наследуе нацыянальнай ідэйна-эстэтычнай традыцыі.

Аднак Л. Рублеўская не толькі выкарыстоўвае досвед дэтэктыўнай, прыгодніцкай, меладраматычнай, нацыянальнай літаратур. Яна таксама шукае і новага, надаючы такім чынам жыццёвасці старым стэрыятыпам. Асабліва відавочна гэта ў сістэме жаночых персанажаў, дзе назіраецца ажыўленне рамантычнага вобразу жанчыны. Гэта адбываецца праз наданне яму надзвычайных уласцівасцяў, у тым ліку ўскладненне характару і ўвядзенне яго ў акалічнасці сучаснага жыцця. Іншымі вымагаюць быць і сітуацыі, асяроддзе. Сучаснасць надае ім больш імклівасці, экстрэмальнасці. Вартая адзнакі і такая асаблівасць тэкстаў пісьменніцы, як паралельнае суіснаванне двух светаў – сучаснасці і мінуўшчыны, што найбольш выявілася ў рамане "Золата забытых магілаў". Такая форма з'яўляецца найбольш спрыяльнай для ўвасаблення значнай ідэі пра неабходнасць перадачы і захавання гістарычнай памяці. Як вынік гэта робіць немагчымым успрыманне тэкстаў аўтаркі выключна як носьбітаў адзнак масавай літаратуры, апазіцыя "высокае" – "нізкае" здымаецца.

Важным падаецца і тое, што рэалізаваныя Л. Рублеўскай элементы масавай літаратуры не ёсць самамэтай. Яны выкарыстаныя **дзеля** чагосьці. Так, дэтэктыўна-прыгодніцкія, меладраматычныя па сваёй сутнасці сітуацыі, абставіны ў творах ненавязліва, але скіроўваюць свядомасць чытача да актуалізацыі важных праблем; а рамантычныя героі не проста дэманструюць кемнасць, смеласць, высакародства, але незаўважна вучаць – быць шчырымі, адкры-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тымі, беларускімі. Таму і тэксты аўтаркі маюць адметнае значэнне для нашае культуры і часу: яны арганічна спалучаюць этычнае, грамадска-значнае і забаўляльнае.

У сваіх кнігах Л. Рублеўская спрабуе – і не без поспеху – вынайсці рэцэпт добрага мастацкага тэксту. У ім мусіць быць па каліву ад самых разнастайных формулаў дэтэктыўнай, прыгодніцкай і меладраматычнай літаратур. Сітуацыі і характары, апісаныя ў ім, маюць быць адначасова ўнікальнымі і простымі. Унікальнымі ў сваёй надзвычайнасці, нетыповасці і простымі паводле мастацкай рэалізацыі, а таксама адзначасці разумення. А сам тэкст павінен існаваць у прасторы агульначалавечых катэгорыяў ісціны, дабра, прыгажосці.

**Abstract.** The paper considers the prose of Ludmila Rubleuskaya, particularly the part which is oriented to the means and methods of mass literature. Special attention is paid to the syncretical character of the texts under investigation, which are built on the ground of three-genre system: detective, adventure, drama. The texts of the writer which are organized according to the formula of mass literature include at the same time ethic and socially significant points.

**Літаратура**

1. Рублеўская, Л. Сэрца мармуровага анёла / Л. Рублеўская – Мн.: Мастацкая літаратура, 2003. – 288с.

2. Рублеўская, Л. Золата забытых магілаў / Л. Рублеўская // Дзеяслоў, №№ 9, 10.

3. Кавелти, Дж. Изучение литературных формул / Дж. Кавелти // Новое литературное обозрение. 1996, № 22. – 33-64с.

4. Караткевіч, У. Зб. тв. У 8 т. Т. 4. Каласы пад сярпом тваім: раман, кн. 1. / У. Караткевич – Мн.: Мастацкая літаратура, 1989. – 399с.

Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Поступило 11.01.07

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ